**Мурзіч, В.** У гэты дзень ён заўсёды бывае ў Глыбокім / В. Мурзіч ; гутарыў А. Жыгуноў // Веснік Глыбоччыны. — 2019. — 16 лют. — С. 3.

## У ГЭТЫ ДЗЕНЬ ЁН ЗАЎСЁДЫ БЫВАЕ Ў ГЛЫБОКІМ



***Валянцін Мурзіч** (на здымку) жывеў Мосары і працуе на льнозаводзе. Па той прычыне, што на прадпрыемстве спраў шмат, а дома яшчэ – вялікая асабістая гаспадарка, у горадзе бывае вельмі рэдка. Але ёсць дзень, калі ён проста неможа не прыехаць у глыбокае і не пастаяць у маўчанні каля помніка воінам-інтэрнацыяналістам у парку перамогі. Валянцін – з тых нашых землякоў, якія прайшлі выпрабаванне афганістанам.*

З Валянцінам Мурзічам сустрэліся напярэдадні 15 лютага, Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. І гутарка ў нас адбылася доўгая, шчырая, у ходзе якой шмат чаго даведаўся пра гэтага, на маю думку, даволі цікавага чалавека. І рэй у размове вёў мой субяседнік.

**– Валянцін, вось вы сказалі, што на працы вельмі заняты. Патлумачце, калі ласка.**

– Заняты. Я і токар, і на «Амкадоры» працую, і дзяжуру. Бывае, і па начах. Таму, калі дзяжуру, часу ў мяне хапае, каб асэнсаваць сваё жыццё, успомніць родных і блізкіх, сяброў, з якімі служыў. Так, як і многія, я мог не вярнуцца з Афгана. Я толькі цяпер, калі ўвабраўся ў гады і мне ўжо 49, думаю пра гэта. А ў маладым узросце – мяне прызвалі ў армію другога лістапада і мне не было яшчэ дзевятнаццаці – пра гэта неяк не думалася. У маладосці ж усе мы рамантыкі і так разважаем: наперадзе яшчэ столькі многа часу, і мы яшчэ столькі паспеем зрабіць добрага і для сябе, і для людзей. Цяпер жа разумею: мог зрабіць і больш, а не зрабіў, і наперадзе засталося ўжо менш часу, чым пражыў.

**– І якой жа была ваша маладосць?**

– Цікавай, актыўнай. Вучыўся ў Мосарскай школе, закончыў Удзелаўскую сярэднюю. Пасля школы трэба было выбіраць свой шлях у жыцці. І я разважыў, што прафесія павінна быць не выпадковай, як кажуць, разавай: маўляў, пайду вучыцца хоць куды, далей ад бацькоў, а там – як атрымаецца. Яна павінна быць патрэбнай табе. У выбары памог мне мой дзядзька Пётр, чалавек даволі-такі прагматычны. Казаў мне: «Вучыся на токара ці зваршчыка. Калі станеш спецыялістам высокага класа, будзеш заўжды запатрабаваным». Прыслухаўся да парады. З’ездзіў неяк у Даўгаўпілс і зачараваўся ім: горад прыгожы, спакойны. Знайшоў вучылішча, дзе можна вывучыцца на токара. Закончыў яго. Пахадзіў на вячэрнія курсы вадзіцеляў – і набыў яшчэ адну прафесію. Калі вучыўся ў школе, атрымаў правы трактарыста. З трыма прафесіямі можна было смела ісці па жыцці І я пайшоў. Працаваў, пакуль не атрымаў позву ў ваенкамат.

**– У Даўгаўпілсе?**

– Так. Неўзабаве нас, прызыўнікоў, накіравалі ў Рыгу. Там прайшлі камісію, і на нейкі час нас адпусцілі дадому. Калі зноў прывезлі ў Рыгу, то ўжо размясцілі ў казарме воінскай часці. Была яшчэ адна медыцынская камісія. І з 80 чалавек – столькі адпраўлялі з Даўгаўпілса – толькі 50

трапілі ў вучэбны цэнтр. Усіх нас, вядома, хвалявала такое пытанне: «Куды нас збіраюцца адпраўляць?», паколькі хадзілі чуткі, што – у Афганістан. Афіцэры супакойвалі: «Няпраўда, будзеце служыць у СССР». І толькі пры адпраўцы ў аэрапорт хтосьці з іх па сакрэце сказаў, што чуткі – не чуткі, а рэальнасць. Ва Уладзікаўказе нас накіравалі ў вучэбку, дзе рыхтавалі механікаў-вадзіцелей для адпраўкі ў Афганістан.

**– Як успрынялі гэта?**

– Нармальна. Усе маладыя, здаровыя, смелыя. Хапала і рамантыкі. У роце матэрыяльнага забеспячэння сустрэў двух сваіх землякоў, беларусаў: адзін працаваў інструктарам па ваджэнні, другі – быў пры штабе. І ён папярэдзіў, што будзе яшчэ адзін адбор, камісія, і ў мяне можа быць выбар: ці ў Афганістан, ці на будаўніцтва дарог у Нечарназем'і, ці куды-небудзь яшчэ. А я адказаў: «У Афганістан. Пайду разам з усімі». Ведаеце, быў душэўны парыў, усе хацелі праявіць сябе, дастойна паслужыць Айчыне. Запомніўся адзін эпізод. Хлопец з Валгаграда, якога забракавалі па стане здароўя, праводзіў нас са слязамі на вачах: яму так хацелася быць з намі. Мы за час вучэбкі здружыліся, сталі адной камандай. З Мінеральных Вод на самалёце – у Ташкент, пасля зноў на самалёт і – у Кабул.

**– Служылі ў Кабуле?**

– Не, на заставе каля старажытнага горада Баграма, што кіламетраў за 60 ад Кабула. Ахоўвалі ваенныя аб'екты, суправаджалі калоны. Я быў камандзірам самаходнай машыны, на якой была ўстаноўлена супрацьтанкавая кіруемая ракета. Меў пры сабе аўтамат. Заставу абстрэльвалі, і мы вялі агонь у адказ. Падчас аднаго з абстрэлаў мяне лёгка параніла асколкамі.

**– Калі шчыра, страшна было? На вашых жа вачах гінулі сябры.**

– Гінулі. З нашай каманды дамоў не вярнуліся пяць чалавек. Мне пашанцавала. І ўсё ж не скажу, што я баяўся, страшна стане значна пазней, калі ў сны будуць прыходзіць успаміны аб тым часе. Дарэчы, наш прызыў – адзін з апошніх. Па сутнасці мы закрывалі знаходжанне савецкіх войск у Афганістане.

**– І як пасля вяртання на радзіму, на Глыбоччыну, склаўся ваш лёс?**

– Працаваў шафёрам у аўтабазе раённага спажывецкага таварыства. Але праз нейкі час вярнуўся ў вёску. Я чалавек веруючы, хаджу ў касцёл, і, калі Юозас Булька прапанаваў стаць ягоным вадзіцелем, адразу згадзіўся. Вярнуўся ў Мосар. Неўзабаве пазнаёміўся з дзяўчынай, пакахаў яе, яна пакахала мяне. Пажаніліся. Трэба было будавацца, наладжваць сямейны быт. Бацькі сказалі: «Сынок, будуйся ў Мосары, лепшага месца не знойдзеш нідзе». Паслухаў іх. Сваімі рукамі пабудаваў дом.

**– ...нарадзіў сына, пасадзіў дрэва.**

– Так і было. У нашай сям'і чацвёра дзяцей: два сыны і дзве дачкі. І дрэва я пасадзіў. І не адно.

**– Значыць, усё добра?**

– Усё добра. Дзякуй Богу і за выпрабаванні, і за радасці. Кажуць так: Бог нам усім дае такі крыж, які мы можам панесці. І я свой нясу. І радуюся кожнаму пражытаму дню.

**– Валянцін, дзякуй вам за размову.**

– І вам дзякуй.

**Алесь ЖЫГУНОЎ**